УДК 808.81:392.5(=16)

# Славянскія вясельныя абрады праз прызму колеравага кода міфапаэтычнай свядомасці

Інна ШВЕД

Доктор філологічних наук, професор
кафедри білоруського літературознавства Закладу освіти
"Брестський державний університет імені О. С. Пушкіна",
Республіка Білорусь, 224016, м. Брест, вул. Міцкевича, 28/329
e-mail: shved_inna@tut.by

*У статті проаналізовано "мову" кольору у слов'янських обрядових текстах весілля, виявлено синтагматичні та парадигматичні зв'язки колірних символів (білого, чорного, червоного, жовтого, зеленого, синього, сірого). У результаті історико-генетичного і функціонально-семантичного дослідження колірного коду обрядів весілля і слов'янських народних уявлень, пов'язаних зі зміною соціального та сімейного статусу молодих, зроблено висновок, що за допомогою елементів колірного коду змодельовано фази переходу нареченої та нареченого в новий стан, символічно і магічно "запрограмовано" благополучне життя молодят і їхніх майбутніх дітей, виражено ідеї захисту, компенсації, ліквідації певного дефіциту, передано інформацію про психо-фізичний, соціальний, матеріальний стани учасників весільного обряду, виявлено естетичні та інші оцінки.*

*Ключові слова: обряд, весілля, колірний код, семантика, символіка.*

Белы і чырвоны колеры – гэта вызначальныя чыннікі "мовы" славянскага абрадава-міфалагічнага тэксту вяселля, арганізуючыя фактары міфалагічнай храматычнай камунікацыі, скіраванай на паспяховы пераход маладых у новы стан дзеля стварэння новай сям'і і працягу рода, на пераўтварэнне сямейна-ўзроставага становішча членаў двух родаў, што звязана з пераадоленнем рытуальных меж. Прадметы белага колеру (ручнікі, абрусы, палатно, посуд, пірог і інш.) – адмысловыя ідэальныя рэчы, змешчаныя ў кантэкст касмаганічных міфаў, – абавязковыя атрыбуты вясельных рытуалаўрозных славянскіх народаў. Так, у Польшчы (Сувалшчызна) прадаўгаваты каравай-"карову" накрывалі белай хусткай. Гэты каравай замяшчаў карову, якую нібыта купілі і забілі ў сувязі з вяселлем [22, с. 89]. У Беларусі вясельны стол накрываўся белым палатном, такое ж палатно сцялілі маладым пад ногі. У Закарпацці маладыя пераступалі праз белае палатно з мэтай засцярогі ад усяго шкоднага [18, с. 302]. У Карпатах такое палатно як абярог клалі на парозе жаніховай хаты, каб па ім праходзіла маладая; як варыянт нявестку маглі перавозіць праз агонь ці яна сама скакала праз вогнішча – такім чынам ахоўвалі хату ад "чужой" сілы [18, с. 306]. У палескім рытуале сумеснага "пасаду " маладых іх садзілі на неабмалочаныя снапы, накрытыя белым палатном [18, с. 302]. Паводле беларускіх вясельных песень, у рытуале "пасаду " магла скарыстоўвацца як белая, так і чырвоная тканіна ("*...Ён мяне завець на пасад... // На бялёвенькі ручнічок*" [4, кн. 2, с. 479]; у іншай песні, калі нявесту клічуць на пасад, яна адказвае: "*Засцель чырвон колер, то пайду*" [4, кн. 2, с. 470]). Белае магло сімвалічна асацыявацца з катэгорыяй

жаночага, тады мужчынскае абазначалася блакітным ці іншымі колерамі. Так, у шэрагу мясцовасцяў Палесся пры ўпрыгажэнні каравая нявесты, у адрозненне ад жаніховага, дамінаваў белы колер. У дзявочы вечар выраблялiся кветкі для маладых і гасцей: белай і ружовай стужкамі перавязваліся кветкі для дзяўчат (жанчын), блакітнай – для хлопцаў (мужчын) [ФЭАБ; Бярозаўскі, Жабінкаўскі, Брэсцкі раёны].

У славянскіх вясельных песнях згадванне многіх рэаліяў суправаджаецца эпітэтам "белы", які толькі фармальна ўказвае на колер, але па сутнасці – на асаблівы статус прадметаў, на іх важнае абрадавае значэнне, выяўляе сімволіку пераходнасці, рытуальнай чысціні, прыгажосці, дасканаласці. "Белы" знаходзіцца ў адным радзе з эпітэтамі "высокі ","харошы", калі з найлепшага боку яны характарызуюць каравайніц (што, дарэчы, не пазбаўлена магічнага сэнсу): *"Ой, чыя ж то жона коровай мысыла, // Шоўком, золотом рукава нашыла. // Білая муку сіяла, // Высокая расчыняла, // А хороша в піч сажала"* [ФЭАБ; Моталь Іванаўскага р-на]. Паводле песні, што гучала ў зборную суботу, хата нявесты павінна быць белай ('чыстай'): *"Тыпэр субота, а завтра ныдыля, // Подывысь, дівонька, чы хата біла. // Шчоб была біла, шчоб ны пыліла. // Поідуть госты з чужэі волысты, // Будуть вытаты, будуть пытаты: // Дэ тое дыте, шчоб нам забраты?"* [ФЭАБ; Дзягелец Бярозаўскага р-на]. У сербскіх вясельных песнях падкрэсліваецца, што жаніх, едучы па нявесту, бачыць яе "б'јеле дворе" [8:237]. Паводле рускіх вясельных песень, нявеста знаходзіцца "в белой горнице ", за "белой занавесой","за белым столом " [12, с. 204, 275]. Маці, выпраўляючы сына па маладую, раіць: *"Ты взойдешь, сын, в белу горенку – // Не вставай, сын, под матицу"* [12, с. 192]. Жаніх, паводле рускіх песень, сядзіць"в бел шатре", туды да яго прыходзіць забаўляцца нявеста [12: с. 209]. Само вясельнае застолле ў беларускіх песнях называецца белым [4, кн. 4, с. 122].

Шырокая прадстаўленасць і асаблівасці сімволікі вобразаў белых прадметаў у абрадавых песнях абумоўленыя функцыянальнымі сувязямі гэтых песень. Прыкладам, паводле беларускіх каравайных песень, каравай стаіць "пад белюхна хуста" [4, кн. 2: 68], а сам каравай і "шышачкі", якімі ён упрыгожваецца, характарызуюцца як "беленькія" [4, кн. 2, с. 46, 137]. Пра звенчаных маладых спявалі: *"...Да звязаў да айцец ручкі... // Белаю да бяліцаю // Да з чужым чужаніцаю, // Да з белаю да кітайкаю..."* [4, кн. 3, с. 294] (калі маецца на мэце перадаць ідэю цяжкага жыцця, якое чакае нявесту ў хаце мужа, "белая бяліца", якой звязваюць рукі маладым, замяняецца "чорнай чарніцай",). Калі "кацілі вянок па стале", спявалі: *"...А звіўшы, вянок пакаціла // Усё й па століку цісовым, // Усё й па абрусіку бялёвым"* [4, кн. 2, с. 265]. У шматлікіх вясельных песнях славян паэтычна прадстаўляюцца акты рытуальна-сімвалічнага размеркавання долі, узаемаабмену паміж двума родамі – абдорвання нявестай персанажаў вясельнага абраду рэчамі белага колеру. Паводле рускіх вясельных песень, нявеста тужыць, што яе *"белые дары да недобелены"* [12, с. 196], ці галосіць: *"Уж вы дары, мои дары, // Тонки, белы, полотняны! // Не год я вас пряла..."* [12, с. 240]. Белым колерам могуць маркіравацца падарункі, атрыбуты рытуалу, якія атрымлівае нявеста. Так, белай намёткай, паводле беларускай песні, маці абдорвае дачку-нявесту [4, кн. 4, с. 439]. Пазітыўна асэнсаваны вобраз белай каровы, цяля якой прыйшлося дарэчы на вяселле, актуалізуецца ў наступнай песні: *"...В мэнэ корова біла // Пызно тылетко міла. // А я корову доіла // І тылетко поіла, // На высілле шчаділа"* [ФЭАБ; Прыбарава Брэсцкага р-на].

У розных славянскіх традыцыях белым маркіруюцца элементы касцюма нявесты. Паводле шматлікіх беларускіх запісаў, нават пры недахопе матэрыяльных сродкаў маладую стараліся апрануць менавіта ў белае. Інфарматары згадваюць сваё вяселле: *"Тоды, як я замуж выходыла, то продавалыся на Брунну́й горі простыні, бо тогды вжэ крышку война кончылася. То купыла простыню, пошыла юбку білу, пошыла комызэльку, да гэтак і вынчалысь"* [ФЭАБ; Нівы Бярозаўскага р-на]; *"...Платте було нэякэ, білый шарфік на голову був такый капроновый"* [ФЭАБ; Старое Сяло Жабінкаўскага р-на].

Рытуал замены белай шлюбнай сукенкі нявесты на іншую вопратку маркіруе адну з найважнейшых фаз жыццёвага пераходу: "<Ціснуе ў вас абрад завівання маладой?> –*А як жэ ж! Молодую всюды завывалы. Як завывають – то вжэ значыть, шо молодая вжэ ны девка, а жэнщчына. Завывае молодую свэкруха врано после вэсілля, як молодыі повстають. Завыванне начынаецця з хусткі. Свэкруха выводыть молодую на двір до всіх, хто остався после вэсілля. Здымае з нэвісткі білого вэлёна і завязуе хустку. После вэдэ еі знов дохаты і там пэрэдягае в жэноцке: здымае тую білукошулю, шо була на молодуй на вэсіллі, і вдягае вжэ спудныцю, кошулю, фартух, подпарязвае поясом, які вышыла сама спецыяльно для нэвісткі. І знов выводыть надвір.На дворі маты молодэі дае юй в рукі коцюбу, сэрпа. І з того часу молодая вжэ жэнщчына*" [ФЭАБ;Альха Брэсцкага р-на].

У шматлікіх вясельных песнях славян знакавыя элементы касцюма нявесты выяўляюцца як белыя, у прыватнасці згадваюцца белыя сукенка, "*покрывало*", "*наміточка*","*платочек*","*чапочак*","*вяночак з белага шоўку* (ці з *беленькай паперы, белых руж*)","*кика белая*","*белобисерный почелок*","*rúbok* "і г. д., прыкладам: "*Ой скажітэ Танечкынуй матцы, // Ныхай пуйдэ в новую комору, // Ныхай прынысэ білэ покрывало, // Ныхай покрые мою русую косойку…* " [ФЭАБ; Гвозніца Маларыцкага р-на]; "*Шыла кашулю // З белага кужалю, // Я ў ёй і звянчалася…*" [4, кн. 2, с. 403]; "*Учора была ў руцяным вяночку, // А сягоння у белым чапочку*" [4, кн. 6, с. 211]. У славацкай вясельнай песні нявеста, звяртаючыся да сваіх валасоў, паведамляе, што яны пойдуць пад "*rúbokbielený*" [20, с. 633].Падобная песня шырока вядомая на Беларусі. На Чарнігаўшчыне, калі ўносілі жаночы галаўны ўбор, свахі спявалі: "…*На тарілочці да наміточка, // Як біль білесенька… // До паперу рівнесенька*" [18, с. 305].

Белым колерам у абрадавым фальклоры можа пазначацца адзенне не толькі нявесты, але і жаніха: "*Ой, нету, нету лепшага роду, // Як мілы дружочак: // На нём світа шоўкам шыта, // Кашулька тонка, бяленька…*" [4, кн. 4, с. 385]. У вясельных песнях з матывам "дачка аддае перавагу жаніху перад сваякамі" бацькаваму "сівенькаму ярмачку" проціпастаўляецца жаніхоў "беленькі кажушок" – пад яго хаваецца дзяўчына [4, кн. 4, с. 350]. І нявеста, і жаніх могуць у песнях называцца белымі ("*Страйнюсенькі, бялюсенькі малады…*" [4, кн. 1,с. 198]; "…*Прыбярона, як бель бела*" [4, кн. 3: 106]), нявеставы косы асацыююцца з белым кужалем ці белым жэмчугам [4,кн.1,с.52,53]. Белы 'прыгожы' жаніх проціпастаўляецца чорнаму 'непрыгожаму': "*Любіла белага кудравага – // Засталася чорнаму, нязграбнаму*" [4, кн. 4: 393]. Паводле апазіцыі "белы/чорны" (другі член якой выяўляе непасрэдную карэляцыю з чужым) маладыя могуць проціпастаўляцца цыганам: "*Цыганы чарненькі, // А яны ж бяленькі*" [4, кн. 3, с. 334]. Увясельных песнях славян белы колер, асэнсаваны як знак прыгажосці, чысціні, дасканаласці, урачыстасці можа вызначаць і іншых удзельнікаў абраду ("*Па застоллейку пышныя баяры садзяцца. // На ўсіх рубашачкі бяленькія…*" [4, кн. 1:205]; "*Каля тыя паванькі белыя лябёдкі... // Белыя лябёдкі – сваццi твае*" [4, кн. 1, с. 54]; "*Невестина сваха беляна, // Она три года по насту ходила, // Она три года обросы белила…*" [12, с. 347].

У славянскіх вясельных песнях з мэтай праслаўлення традыцыйных вартасцяў тыповых персанажаў вяселля нярэдка актуалізуюцца вобразы жаночых белых рук, плеч, твару, грудзей, прыкладам: "*Как Ивануша матушка // В воскресенье спородила, // Да белой грудью кормила…*" [12, с. 274] (эпітэт "белы" ў такіх кантэкстах выступае як сталы). У "паненскі вечар ", паводле беларускай песні, нявеста "*русу косу распляцець, // І папусціць яе па белых плечках буяці*" [4, кн. 2, с. 309]. У рускай вясельнай песні нявеста скардзіцца на сваху: "*Распустила мою косыньку по белым плечам…*" [12, с. 211]. Белыя рукі маюць бацька і маці нявесты, прыкладам: "*Приходил мне сударь батюшка… // Он и брал на белы рученьки…*" [12, с. 214]. Ва ўкраінскай вясельнай песні спяваецца, што маці нявесты выходзіць "*з нової світлиці // Білими ногами*" [13, с. 126]. Тое, што эпітэт "белы" ў падобных кантэкстах не мае гендэрнай прывязкі, скарыстоўваецца як сродак паэтызацыі прадстаўнікоў і мужчынскай, і жаночай

паловы чалавецтва, можа сведчыць, сярод іншага, пра яго абсалютную эстэтычную вартасць. Тое ж датычыць эпітэта "чырвоны". У прамых ці ўскосных параўнаннях, якія адносяцца да маладых, нярэдка фігуруюць белы і чырвоны колеры: "...*Стоіть дыток пара: // Обое рывнюсенькэ, // Як біль білюсенькэ, // Як біль, як былэна, // Як чырвона калэна*" [ФЭАБ; Прыбарава Брэсцкага р-на]. Падобным чынам ствараюцца паэтычныя партрэты іншых галоўных персанажаў вяселля, прыкладам свахі: "*Гожа свашэнька, гожа, // Як чырвона роза, // Як біль, як былэна, // Як чырвона калэна, // Як ясное сонцэ, // Шо світыть в оконцэ*" [ФЭАБ; Прыбарава Брэсцкага р-на]. Белы колер, які асацыюецца з рытуальнай чысцінёй, як неаднойчы ўказвалася ў літаратуры пытання, можа надзяляцца адваротным значэннем нечысціні, "нячэснасці" нявесты і процiпастаўляцца пры гэтым чырвонаму колеру, які прэзентуе першы шлюбны досвед, калі адбылася дэфларацыя нявесты [2, с. 262].'

Калі нявеста была "чэсная","*на бутылку з гарэлкой завязвалі чырвону ленту ешы і квэток прычэпят, і называласа гэтая бутылка краса. Як ідут у запоіны і тую бутылку бэрут, і тая бутылка вжэ до конца свадзьбы была*" [ФЭАБ; Дзягелец Бярозаўскага р-на]. На Палессі ў хаце жаніха, куды пераходзіць нявеста, высока вывешваюць чырвоную хустку [ПА; Велута Лунінецкага р-на]. Такую хустку маглі прывязваць да асіны, устаноўленай на жаніховай хаце, з матывіроўкай: каб маці маладой на наступны дзень "*не заблудзілася б, калі ехала да сваёй дачкі*" [ПА; Велута Лунінецкага р-на]. У Польшчы, калі пасля "пакладзін " высвятлялася, што нявеста была цнатлівай, чырвоную хустку вывешвалі на дзвярах каморы, кашулю маладой перавязвалі чырвонай стужкай або чэплялі чырвоныя стужкі на вясельныя пірагі, што падаваліся гасцям [22, с. 169]. Чырвоныя ніткі і стужкі атрыбутавалі вясельны хлеб і ў іншых славян. У Беларусі каравай маглі ўпрыгожваць наступным чынам: "*до шышок прывязвалы ялыну, овэс, бэрвінок чырвонымы ныткамы. Шышкі ўсі разом утыкалы ў коровай. Усі шышкі звязвалы чырвонэю лентою*" [ФЭАБ; Моладава Іванаўскага р-на]. Чырвонай ніткай абмотвалі рогачі, якія ўтыкалі ў каравай [9, с. 339], а таксама сам каравай, што суправаджалася словамі тыпу: "*А дэ ж наш зайчык? // Ныхай прынысэ нам // Чырвоны ныты каравай уповыты*" [ФЭАБ; Перасудавічы Бярозаўскага р-на]. Зверху каравай накрывалі чырвонай хусткай. Прывядзём характэрныя прыклады: "[Каравай упрыгожвалы] *цвітамы. З яблыні веткы різалы, так тры ўтыкалы ў каравай. Бумагою ўкрашалы і стояў ўжэ. А потом, як ўжэ выносылы его, красны платок накыдалы і выносылы ўжэ на стул, ўжэ ділыты, як ўжэ это свадьба*" [ФЭАБ; Нівы Бярозаўскага р-на]; "*Я часто була коровайніцою. І ў одной бабы була неяк. То цесто замэсілі, усё добрэ зробілі, усадзілі у пэч. І такі красівы коровай выйшоў, подрос. Думалі, з пэчы нэ вымэм. А як вынялі, то вон рэзко ўпаў. А я вжэ злекаласа, побегла до бабы старэнькое попытаці, шо мне робіці. А потом на другі дэнь другого коровая пэклі – і той упаў. Тоды мы ужэ ёго чырвоною хусткою накрылі і так понэслі. А потом, после вэселля года з два пройшло, і оказалоса, шо у гэтое пары дэтэй нэ можэ быці. О, гэтак було!*" [ФЭАБ; Сакалова Бярозаўскага р-на]. Выпечаны каравай упрыгожваўся кветкамі з чырвонай паперы [ФЭАБ; Перасудавічы Бярозаўскага р-на]. Матывы ўпрыгажэння каравая, у тым ліку пры дапамозе чырвоных прадметаў, маюць відавочныя эратычныя і матрыманіяльныя канатацыі: "*Каравай, караваю, я тэбэ ўбіраю // У чырвоны квіты, // Каб любілыся діты*" [ФЭАБ; Перасудавічы Бярозаўскага р-на]; "*Ой, убырайся, короваю, // То ў грудку, то ў мятку, // То ў чырвоные квіты, // Коб любылыса діты*" [ФЭАБ; Моладава Іванаўскага р-на]. Шырока прадстаўлены чырвоны колер з яго сімволікай нявеставай цноты, прадуцыравальным значэннем і ў іншых актах вясельнай абраднасці. На Івацэвіччыне на запоінах "*банку абвязваюць чырвонай стужкай* [ФЭАБ; Гошчава]. У Іванаўскім раёне "*сваты прыходылы з хлібом і гарылкею. І на кажный угол стола ставылы по пляшцы. А одну пляшку ставылы ў цэнтр, еі обвязвалы чырвоною лентою і прывязвалы квяту*" [ФЭАБ; Моладава]. На Століншчыне, калі ішлі ў сваты, "бацько молодого з хрышчоным, або дзяцьком бралі хлеб, пера-

вязаной красной лентой " [ФЭАБ; Сямігосцічы]. У Іванаўскім раёне "скалля" – жанчына, якая ішла да бацькоў дзяўчыны "ў пярэпыты ", –цягнула за сабой доўгі чырвоны "мотуз" на ўдачу ў сватанні. Вясковыя дзяўчаты пільнавалі "скаллю", каб выхапіць гэты "мотуз", наступіўшы на яго. Калі тое ўдавалася, гэта значыла, што яны не заседзяцца доўга ў дзеўках [ФЭАБ; Моталь]. Калі маладая ў час сватання завязвала чырвоную стужку на бутэльку сватоў, гэта абазначала згоду на шлюб [ФЭАБ; Страдзічы Брэсцкага р-на]. Пасля прыезду нявесты ў хату жаніха яна павінна была *"на колодец, на венік, на заслонку ў печы завязаць красну ленточку"* [ФЭАБ; Белаазёрск Бярозаўскага р-на]. У Беларусі пашыраны звычаі ў час вянчання ў царкве ці касцёле сцяліць маладым пад ногі ручнік або палатно і чырвоны пояс, якім потым звязвалі лыжкі маладых. Інфармант з в. Слаўнае Кобрынскага раёна апавядае: *"…У царквы маладых ставілі на рушнік, пад які клалі чырвоны пояс і два медных пятака. А вось зараз у вас такога няма. Але ж… я гэтакзрабіла. Пасля вяселля бралі вілкіі лыжкі, якімі карысталіся маладыя, лажыліих на рушнік, закутвалі і павязвалі тым паясом, які клалі маладым у царквы пад ногі. Павязвалі ў выглядзе васьмёркі. Дзелалася гэта, каб маладыя былі шчаслівыя і доўгае жыццё"*. На ўкраінскім вяселлі дзве новыя лыжкі, звязаныя чырвонай стужкай, ставілі на стол, які пасля вянчання накрывалі ў хаце маладой, а таксама маладога [13, с. 114]. Чырвонымі стужкамі ўпрыгожваўся вясельны поезд у беларусаў, украінцаў, рускіх, у прыватнасці ў Гарахавецкім краі [16, с. 143]. Цікава адзначыць, што на Поўначы і ў Цэнтральнай Расіі вясельнае гулянне называлася "красный стол" ці "красный обед". Тут прыметнік "красный " указвае не столькі на колер, колькі на характар і пазітыўную ацэнку "стала".

Цікава і наступнае: высокім сакральным статусам і магічнай сілай надзяляліся чырвоныя прадметы, якія былі скарыстаныя ў вясельным рытуале (у прыватнасці, пакрывала, нітка), што павялічвала іх крэатыўна-адраджальныя патэнцыі і ахоўную моц. Чырвоныя ніткі, якімі абвязвалі каравай, "лічыліся памоцнымі. Калі каравай дзялілі (на 3-ці дзень вяселля), разам з шышачкай давалася і нітачка, якую завязвалі на руку ад розных хвароб" [ФЭАБ; Моталь Іванаўскага р-на]).*"Колысь молодые як жынылыся, убіралы коровая такымы цветамы: два двойчакы і був одын тройчак. І ўбыралы іх. А потом, як коровай убыруть, і чырвоною ныткою, і обораночкы так маленькы обводылы вокруг. І вот гэту чырвону нытку бралы малым дітям завязвалы на ручку чы корове на руг. Это ўжо от того, од сурокаў. І як дылять коровая, стараюцця взяты ныточкы чырвоны"* [ФЭАБ; Перасудавічы Бярозаўскага р-на]. Сербы і харваты твар немаўляці закрывалі чырвоным пакрывалам нявесты (істотныя тут, акрамя ўсяго, уяўленні, што навароджаны, як і нявеста, звязаны з тым светам, таму павінен быць нябачным сам і не бачыць прадстаўнікоў гэтага свету, а таксама міфалагічная суаднесенасць чырвонага колеру з засветамі – падрабязней пра гэта гл. [19]).

Чырвоны колер прысутнічаў у касцюме маладых і іншых удзельнікаў вясельнага абраду, падкрэсліваў статус яго галоўных персанажаў. Ідэя правядзення нявесты праз сімвалічную смерць і ўваскрэсенне выражаецца ў сімволіцы так званай універсальнай колеравай трыяды. Так, у рускіх пасля вянчання маладую маглі пераапранаць з чорнай ці белай жалобнай вопраткі ў чырвоную [14, с. 529], што маркіравала новы статус нявесты, набыты пасля адмысловага вяртання яе з іншасвету. Нярэдка актуалізуецца прадуцыравальная і ахоўная семантыка чырвоных элементаў касцюма: вэлюму ці накідкі, якія ў сербаў апранали нявесце зверху хусткі; чырвонай спадніцы, у якой свякроў абсыпала гасцей зернем, а таксама чырвоных прадметаў, што клалі жаніху ў шапку [1, с. 647–648]. Балгары клапаціліся пра тое, каб у касцюме маладых (асабліва нявесты) прысутнічаў чырвоны колер, а дзеляаховы яе ад сурокаў, твар прыкрывалі чырвоным (ці белым) вэлюмам [14, с. 529]. У Беларусі чырвоны колер прысутнічаў у вянку нявесты, яго *"скручвалі на красну ніточку"* [ФЭАБ; Белаазёрск Бярозаўскага р-на]. Завязваючы нявесце чырвоную стужку, якой была перавязана асвячоная вярба, маюць на мэце засцерагчы маладую "ад

урокаў" [ФЭАБ; Гошчава Івацэвіцкага р-на]. У "другасным" ужыванні чырвоная стужка валодае "падвоенай" культурнай семантыкай, якая рэгламентуецца як колеравай прыкметай стужкі, так і адпаведным сакральным хранатопам (чырвоная стужка ўвабрала ў сябе агульную сімволіку Вялікадня).

Чырвоныя шырокія паясы са складаным арнаментам у Беларусі функцыянавалі як маркёры галоўных асоб на вяселлі і лічыліся каштоўным дарам, іх выраблялі спецыяльна для падпяразвання маладой. *"А блізкія маладой гатовілі вясельны стол, а вось падружкі наражалі дзеўку … Маладую не адзявалі ў сваім доме, а ў суседнім. Але ж нельга было пераводзіць цераз дарогу. І таму хату выбіралі, якая знаходзілася на старане бацькоў. Нельга было наражаць маладую ў доме ўдоў, і дзе пaміралі дзеці, і таксама дзе быў пажар. Маладой павязвалі красным поясам – рушніком"* [ФЭАБ; Слаўнае Кобрынскага р-на]. Чырвоным ручніком падпяразвалі і жаніха: *"Пэрэд дорогею до молодэі жэных убыраўса ў вышытую сорочку, новы чоботы, нагавыцы. Сорочку подвязвалы чырвоным ручныком"* [ФЭАБ; Моладава Іванаўскага р-на].

Паколькі, як вядома, здаровым і прыгожым дзіцём лічыцца беласкурае і румянае, чырвоны колер разам з белым актыўна скарыстоўваецца славянамі падчас вяселля, цяжарнасці і пасля нараджэння дзіцяці, што можа адлюстроўвацца ў вербальных формулах, якія суправаджаюць магічныя дзеянні. Так, чырвоныя прадметы ўлучалася ў кантэксты з семантыкай магічнага праграмавання здароўя і прыгажосці дзіцяці на сербскім вяселлі. Сербы лічылі, што калі нявеста і жаніх вечарам разломяць чырвоны яблык і адкусяць па кавалку цукару, то іх дзеці будуць румяныя як яблык і белыя як цукар [5, с. 65]. Каб дзеці былі беласкурымі і румянымі, у Беларусі абмываюць іх малаком, а маці з'ядаюць конаўку брусніцаў у малацэ. У Бярозаўскім раёне пасля замешвання караваю лілі ваду пад вішню, *"коб булы мулудые чы діты хороші, чырвоны, бы вышні молодые"* [ФЭАБ; Спорава].

Ва ўсходнеславянскіх вясельных (як і хрэсьбінных) песнях "чырвонае" выступае ўстойлівым элементам "партрэтаў" станоўча ацэненых персанажаў (часцей жаночых), пры гэтым можна адзначыць другаснасць колеравага значэння чырвонага, якое прысутнічае ў складзе найменняў і зваротаў з семантыкай 'любы, жаданы, дарагі', з гэтым колерам часта звязаны семы 'прыгожы', 'шчаслівы', 'добры', 'дасканалы'. Сімволіка чырвонага актуалізуецца ў вясельна-абрадавай песеннасці ў выпадках, калі неабходна з асаблівай экспрэсіяй шляхам паэтычнай метафарызацыі выявіць ініцыяльныя змены ў жыцці нявесты, падкрэсліць яе асаблівы статус і перадаць ідэю пераўтварэння гэтага свету адпаведна патрабаванням абраду – нявеста чырвоным сукном пакрывае цэркаўку [4, кн. 3, с. 319], калі маладая рухаецца праз луг, то ўсцілае яго "кумачом", ад чаго лугі "краснеюцца" [4, кн. 3, с. 480], а калі едзе праз лес, "кроет его алым бархатом" [12, с. 204]. У беларускіх песнях, якія гучалі пры сустрэчы маладых бацькамі жаніха, актуалізуецца вобраз чырвонага фартушка маладой [4, кн. 6, с. 175], які, як і вянок "на чырвонай кітайцы" [4, кн. 2, с. 285], "чырвоны каснік у касе" [4, кн. 1, с. 372], "чырвоныя шаўкі ўплецены" [4, кн. 4, с. 253], "лента алая" [12, с. 193, 243], сімвалічна звязаны з ідэяй дзявочасці, нявеставай цноты. Карціна трапання, развязвання "алой ленты" жаніхом мае выразны эратычны падтэкст [12, с. 193, 304]. Адбыўшуюся дэфларацыю абазначае таксама сімвалічная карціна вышывання падола чырвоным шоўкам, як у песні, што выконвалася пасля шлюбнай ночы цнатлівай нявесты: *"Швачка была наша Васька, // Вышыла ўкруг падола // Тупой іглой без вушка // І чырвоным шоўкам"* [4, кн. 6, с. 196]. Інфармацыя пра гэтую значную падзею можа транслiравацца праз сімволіку іншых чырвоных прадметаў, асабліва часта элементаў касцюма і абутку (з іх шлюбнай і эратычнай сімволікай), прыкладам: *"Да стаяла Ганечка да на ганку, // Да кроіла чырвону кітайку, // Да паслала бацюхну да падарку. // – Едзь, мой бацюхна, да нябойся, // У чырвоныя чаботкі абуйся"* [4, кн. 6, с. 135]. Паводле ўкраінскіх песень, персанажы вясельнага абраду ўпрыгожаны чырвонымі каралямі, баяры едуць па

маладую *"під червоним оксамитом"*, а ў самой маладой каса развіваецца па чырвоным поясе [13, с. 148, 152, 76]. У рускіх вясельных песнях і прыгаворах маладыя замужнія жанчыны, якія акаляюць нявесту, выяўляюцца ў "красных кокошничках","красных сарафанах", што, акрамя іншага, мае ацэначнае (пазітыўнае) значэнне. Ідэі прыгажосці, багацця, квітнення, плоднасці гэтых персанажаў, выяўленыя праз сімволіку чырвонага колеру, арганічна праецыруюцца на нявесту. Удзельнікі вясельнай чыннасці (нявеста, яе бацькі, свашкі), паводле ўсходнеславянскіх песень, абутыя ў чырвоныя "чабаточкі": *"Гатуйся, мамачка, гатуйся. // У чырвоны чаботкі абуйся "* [4, кн. 3, с. 504]; *"Свашкове, не стойце, // Мураваньку тапчыце // Ножкамі, астрожкамі // І чырвонымі сапожкамі"* [4, кн. 4, с. 109]. У Беларусі, калі рыхтавалі прыданае, ад імя нявесты спявалі: *"Іспраў жа мне адзежачку дарагую… // Чырвоныя чаравічкі ды на ножачкі"* [4, кн. 1, с. 134]. Чырвоныя боты, асацыятыўна звязаныя з цнотай нявесты, выступаюць аб'ектам гонару і ўваходзяць у кантэксты з апатрапеічнай, адгоннай семантыкай. Вельмі паказальнай падаецца вясельная песня: *"Адступіцеся, варогі… // Мы вас падтопчым пад ногі, // Пад чырвоныя чаботы…"* [4, кн. 2, с. 593]. Чырвоныя боты могуць проціпастаўляцца чорным як абутак прыгожы, дарагі штодзённаму, таннаму: *"…А чорненькія па гразі хадзіць, // Чырвоненькія – па саломачке"* [4, кн. 5, с. 329].

Эпітэты *"чырвоная","красная"* для эстэтычнай ідэалізацыі нявесты, як ужо адзначалася, з'яўляюцца сталымі ў песенным фальклоры беларусаў і іншых славян і маюць выразную ацэначную семантыку. (Чырвоны тут нярэдка выступае разам з белым; гл. у вясельнай песні пра нявесту: *"Сама села – чырвона, бела"* [4, кн. 3, с. 423]). Прынеабходнасці фальклорнага эскізавання пэўных ідэальных эталонаў, узвелічэння галоўных удзельнікаў вясельных (як і радзінных) рытуалаў актуалізуюцца вобразы раслін, часткі якіх маркіраваныя чырвоным колерам (так, у беларускім фальклоры – гэта ружа, мята, вольха, мак, вішня, каліна). У вясельных песнях чырвоныя (ружовыя) ягады сімвалічна выяўляюць заключную фазу дзявочага росту. Паводле адной з іх, маці паведамляе сватам: *"Пайшла мая дачушачка ў сад гуляць, // Вішанькі пазбіраць. // Ружовыя вішанькі пазбіраць, // Свайго мілага частаваць"* [ФЭАБ; Смаляніца Пружанскага р-на]. З чырвонымі кветкамі (ці ягадкамі) часта асацыююцца дзяўчына на выданні, нявеста (*"Пушла Манічка в вышнів сад // І схувалася в вынуград. // – Ой, хто ж мэнэ в тым саду найдэ, // З тым до шлюбоньку стану. // Пушов батэнько – нэ знайшов, // Вырвав квіточку, то й прышов. // – Квітка муя чырвоная, // Дытыно муя молодая, // Кому ты сужоная?.. // Пушов Йіванко і знайшов, // Взяв за ручэньку і прышов. // – Квітко муя чырвоная, // Манёчко муя молодая, // Ты мне сужоная"* [17, с. 339]; *"Земляничка-ягодка, // Отчего же ты красна? // Ой, Евланя-душечка, // Да в кого ж ты хороша?"* [12, с. 337]) ці маладыя, як ва ўкраінскай песні: *"Червоні квіти. // Кланяються діти…"* [13, с. 230]. Значна радзей "красным" у паэтычных тэкстах называецца жаніх. Паводле некаторых беларускіх вясельных песень, у яго чырвоная ("красна") шапка [4, кн. 4, с. 112], у шапцы – чырвоная кветка [4, кн. 1, с. 216]. Пры мастацкім партрэтаванні жаніха зрэдку могуць скарыстоўвацца раслінныя і жывёльныя вобразы, ахарактарызаваныя як чырвоныя, прыкладам окунь [4, кн. 6, с. 135].

Адзначым таксама, што прадметы чырвонага колеру актыўна ўжываліся (і ўжываюцца) у матрыманіяльнай магіі, у прыватнасці ў прысушках, прыкладам: *"На клочке бумаги своей кровью при помощи иглы написать полное имя возлюбленного. Эту бумажку положить в яблоко, в котором заранее надо вырезать середину. Потом обвязать яблоко красной нитью приговаривая: "Пусть это яблоко сохнет так же, как по мне будет сохнуть (имя)". Яблоко надо спрятать в укромное место"* [ФЭАБ; Няхачава Івацэвіцкага р-на].

Чорны колеру матрыманіяльных варожбах, прадказаннях, а таксама тлумачэннях сноў абазначае разлуку, нешчаслівае жыццё, бясплоднасць і проціпастаўляецца пазітыўна асэнсаванаму беламу (светламу). Так, чэхі лічылі,

што сустрэча вясельнай дружыны з белай кабылай (каровай) – да дзетанараджэння, а з чорнай – да бясплоддзя [15, с. 152]. У народных тлумачэннях сноў выразнай адмоўнай аксіялагізацыяй вызначаюцца вясельныя атрыбуты, маркіраваныя чорным колерам. Частыя ўказанні на тое, што пабачаныя ў сне чорныя вэлюм, вясельная сукенка, пачарнеўшы пярсцёнак варожаць смерць шлюбнага партнёра [ФЭАБ; Скокі Брэсцкага р-на і іншыя вёскі Беларусі]. Агульная негатыўная ацэнка чорнага перадвызначыла забароны на яго прысутнасць у шматлікіх актах вясельнай абраднасці. На Палессі і ў іншых зонах Славіі забаранялася скарыстоўваць чорную (цёмную) тканіну для ўпрыгажэння вясельнага стала. Між тым чорны разам з іншымі колерамі можа фігураваць у вышыўцы на вясельных падарунках. Так, інфармант з в. Стайкі Івацэвіцкага р-на апавядае: *"Госці на вяселлі дарапь пасуду, падушкі, рушнікі. На падушках, рушніках зялёны, красны, чорны цвета – спаконна беларускія цвета"*. Пры рэалізацыі ўніверсальнай для ўсіх пераходных абрадаў жыццёвага цыкла схемы пераўтварэння галоўнага персанажа, калі актуалізуюцца адметныя фазы пераходу, чорнае (цёмнае) адзенне магло акцэнтаваць "пасіўны" аспект ініцыяцыі нявесты на першым ("сумным") этапе вяселля. У рускіх да вянчання яна сядзела ў хаце ва ўсім чорным і выла; у жалобнай вопратцы калі-нікалі вянчаліся [14, с. 529]. У гэты кантэкст, на нашу думку, улучаецца балгарская традыцыя нашэння парадзіхай цёмнага адзення да саракавога дня.

У вясельных песнях славян, дзе акумулююцца цэлыя блокі колеравых сімвалаў, якія вызначаюцца ідэйна-сэнсавай еднасцю, адным з чыннікаў такога сімвалічнага блока можа быць чорны колер. Так, у апісанні касцюмаў галоўных персанажаў абраду (у прыватнасці, жаніха, дружкі) скарыстоўваецца між іншымі (чырвоным, белым, блакітным, сінім, зялёным, шэрым) чорны колер, прыкладам: *"Как на друженьке кафтан // Голубой, парчевой, // Как на друженьке штаны // Черны бархатные, // Как на друженьке чулки // Белы шелковые… // Как на шейке-то платок, // Будто аленький цветок…"* [12, с. 353]. Цікава, што ў вясельных песнях чорны колер нярэдка мае станоўчую ацэнку і фігуруе ў выяве (ды афармленні) узвышана-святочных адносін паміж персанажамі абраду. Паводле беларускіх вясельных песень, коні жаніха "чорным шоўкам папутаны, серабром пазамузданы" [4, кн. 1, с. 322], а яго вясельная дружына едзе па нявесту "пад чорным аксамітам" [4, кн. 1, с. 431]. Сам жаніх можа выяўляцца ў чорнай вопратцы: *"Ды што ў чорным, на кані дворным – дык то мой"* [4, кн. 4, с. 95]. У песнях, дзе маладая просіць не аддаваць яе замуж, малюецца сімвалічная карціна завязвання варотаў чорным шоўкам, але дружына маладога яго рве і забірае нявесту [4, кн. 3, с. 517]. Чорным колерам могуць маркіравацца падарункі, якімі абменьваюцца ўдзельнікі вясельнга абраду: чорныя чаравічкі дорыць нявесце дружка [4, кн. 4: 257], чорнай каровай і чорнымі сундукамі абдорваюць бацькі дачку-нявесту [4, кн. 4, с. 456] і інш. У вясельных песнях з матывам прарочага сну чорны шоўк, які сокалы ці галубы "развярцелі " ці "расцягалі ", інтэрпрэтуецца як дары, якія нявеста падрыхтавала на вяселле [4, кн. 1, с. 52], ці як "коска" нявесты [4, кн. 1, с. 55]. Эпітэт "чорны" можа быць скразным у вясельных жартоўных песнях з іх гіпербалізацыяй і карнавалізацыяй, пры гэтым ён не абцяжараны выразным адмоўным значэннем: *"Чорна чорначанка па бару, // Прапіў Сяргейка чорную шубу на мяду. // Як стала яго дзеванька бедаваць. // – А як жа мы будзем без чорнай шубы зімаваць? // – Нагонім чорных авец стадолу, // Пашыем чорную шубу да долу"* [4, кн. 4, с. 263].

Пазітыўна асэнсоўваюцца вобразы чорных жывёл (галка, воран, куна, бабёр, собаль і інш.), калі яны актуалізуюцца пры мастацкім партрэтаванні маладых, прыкладам: *"…Дый коцілася чорна галонька з забор'я, // Дый просіла молода Манечка з застолья… "* [ФЭАБ; Хатынічы Ганцавіцкага р-на]; *"Ляціць, ляціць чорна галачка чэраз бор, // А за ёю чоран воран…"* [4, кн. 1, с. 172]; *"Што ж мовіла кунанька // Чорненькаму бобрыку? // Што ж мовіла дзеванька // Маладзенькаму жанішку?.."* [4, кн. 3, с. 406]; *"Не*

*лежи, черной бобр, у крутых берегов, // Черная куна, возле быстрой реки! // Не сиди, Памфил, во чужом пиру...*" [12, с. 210]. Чорныя бабры, звязаныя з нізам Сусветнага дрэва, багаццем, працягам роду, як спяваецца ў вясельнай песні, пойдуць "на шапачку " жаніху [4, кн. 1, с. 221]. Паводле песні з в. Вольна Баранавіцкага раёна,"чорныя саболі " (у вобразна-сімвалічным і семантычным плане бдізкія да чорных баброў) размешчаны "ў падалох сватоў". Сімволіка чорных жывёл чытальная і ў эратычным кантэксце, прыкладам чорныя куна, курыца (з іх міфапаэтычнай суаднесенасцю з ідэямі плоднасці і хтанізму) у сістэме сімвалічных перакадаванняў адносяцца да органаў з падкрэслена жаночай семантыкай. У сувязі са сказаным характэрны вясельны звычай украінцаў кідаць чорную курыцу ў ногі нявесце, пасля таго як яна атрымае бацькоўскае благаславенне [6, с. 336]. Вобраз чорнай курыцы фігуруе таксама ў вясельных прыгаворах тыпу: "*Пырыпываю чорну квоктуху, шоб нывіста поцыловала свыкруху*" [ФЭАБ; Амельянец Камянецкага р-на].

Адзначым таксама, што ў шэрагу фальклорных тэкстаў і рытуальных дзей актуалізуюцца іншыя вобразы, маркіраваныя чорным колерам, якія звязаны з жаночай палавой сферай, маюць семантычную повязь з жаночымі геніталіямі, сімвалізуюць універсальны спараджальны пачатак. Такія вобразы звычайна фігуруюць у абрадавым тэксце другога дня вяселля, прычым акцэнт, натуральна, робіцца на іх трансфармацыі. Прыкладам, эратычныя асацыяцыі рэалізуюцца праз сімволіку сахі і чорнай аблогі: "*Казалі нам, Сямёнка гультай, – // Залатую сошаньку напраўляў, // Чорную аблогу раздзіраў*" [4, кн. 6, с. 184]. (Укажам на міфалагему "зямля – матчына ўлонне", архаічнае атаясамленне жаночых рэпрадуктыўных функцый з пладнасцю зямлі, стэрэатыпны колер якой – чорны, і пашыраную практыку апісання палавых дачыненняў у тэрмінах апрацоўкі глебы). Пэўныя дзеянні зпрадметамі чорнага (ды чырвонага) колеру выяўляюцца як коітус і ў даволі шматлікіх загадках і прыпеўках з эратычным падтэкстам, як у загадцы пра галошы: "*Зверху чорны, унутры красны, а засунеш – ой прэкрасно*" [ФЭАБ; Відзіборац Столінскага р-на]. Узгадаем таксама генітальную семантыку сажы, стэрэатыпны колер якой – чорны.

Між тым вобразы прадметаў, ахарактарызаваных чорным колерам, нярэдка маюць негатыўную канатацыю, прыкладам у вясельных жартоўных песнях тыпу "*Гэй, старшы сват, // Было ў хаце сядзеці... // Чорнай сажай смярдзеці...*" [4, кн. 4, с. 163]. Адмоўнай аксіялагізацыяй, сувяззю з кодам пахавання вобразы рэалій чорнага колеру вызначаюцца ў сірочых вясельных песнях. Прыкладам, маці-нябожчыца просіцца ў Бога да дачкі-нявесты, бо на сірату "чорная смага пала" [4, кн. 3, с. 109]. Гл. таксама з іншых вясельных песень: "чорная смага (у варыянце – смала) пала на губы" памерламу бацьку нявесты, таму ён не мае магчымасці азваецца да дачкі [4, кн. 3, с. 184], "чорная кітайка вочы закрыла" і нявестаў бацька не можа "прагляну ці " [4, кн. 3, с. 197]. У сірочыхвясельных песнях часта абыгрываецца вобраз чорнай дарогі, па якой "сіротачкі" ходзяць да бацькоўскай магілы ці да Бога з просьбай, каб Ён выпусціў бацькоў на зямлю [4, кн. 3, с. 91]. Дарэчы, небяспека, цемната, даўжыня шляху-дарогі вясельнага поезда выяўляюцца таксама праз сімволіку чорнага колеру, якім маркіруецца гэтая дарога. Сама нявеста-сірата асацыюецца з "чорнай ягадай смародзінкай", у якой "хоць і ёсць цвяточак, да не красненькі" [4, кн. 3, с. 161].

Праз актуалізацыю сімволікі чорнага колеру часта апісваюцца перспектыўна значныя з'явы жаночага жыцця, якія носяць негатыўны характар, перадаецца ідэя разрыву звыклых сацыяльных сувязяў нявесты і адносін маладой замужніцы, "вольна воля" якой, паводле рускай вясельнай песні, "во черной грязи замешалася" [12, с. 261]. Таму натуральным выглядае тое, што ў жартоўнай песні, якая спявалася падчас завівання маладой, выканаўца гэтага абраду – дзядзіна – параўноўваецца з чорнай гадзінай [4, кн. 6, с. 293]. Вобраз жаночага галаўнога ўбору, які замяняе дзявочы вянок, у такіх кантэкстах можа маляваца чорнай фарбай, што вяшчуе адмоўныя

зрухі ў лёсе нявесты: "*...А заўтра раненька знімуць з цябе вяночак, // Накладуць чорну шапухну, // Не ўбачыш больш яснага сонейка, // Хоць і будзе сонейка, але толькі дзеванькам, не бабанькам*" [4, кн. 5, с. 75]. Гэтая ж ідэя часта рэалізуецца праз абыгрыванне апазіцыі "белы/чорны": "*А я думала, нагаечка з белага паперу, // А анно ж гэта нагаечка з чорнага раменя*" [4, кн. 3, с. 550]. Цяжкае жыццё ў хаце свякроўкі малюецца праз карціну пачарнення белых рук маладзіцы ад "чорнай работы" [4, кн. 5, с. 112]. Між тым у вясельных песнях семантычная апазіцыя "белы/чорны" (ці "рознакаляровы/чорны") можа выяўляць шырокі спектр эмацыянальна-драматычных адносін і накладвацца пры гэтым на розныя апазіцыі тыпу "шлюб/бясшлюбнасць","высокае/нізкае (сацыяльнаестановішча)","багацце/беднасць","шчасце/няшчасце","прафаннае/сакральнае" і інш., прыкладам: "*Як ты гуляла – перабірала // Шляхтамі, мяшчанамі – // Выбрала сабе чалядзіначку, // Што ў белай сярмяжачцы. // – Нашто мне шляхта, нашто мяшчане, // Што ў чорных чарнінах?..*" [4, кн. 4, с. 424]; "*Как у нас Варваронька изменчивая, // Не хотела она замуж выходить, // Обещалась в монастырь с нами идти, // А мы,глупы, понадеялись на неё, // Все пошили платья черные...*" [16, с. 149]; "*Ты поехал бы, чужой чуженин, // Во прекрасный во монастырь... // Уж ты снял бы платье цветное. // Приодел бы платье черное, // Платье черное печальное*" [12, с. 371].

Жоўты колер, сімвалізуючы няшчасце, хваробу, смерць, у шматлікіх кантэкстах славянскай фальклорнай традыцыі надзяляецца адмоўнымі ўласцівасцямі і развівае цэлую метафарычную вобласць значэнняў – здрада, разлука, падман. Так, у Беларусі лічаць, што жоўтая хустка, убачаная ў сне, варожыць разлуку [7, с. 420]. У Ратнаўскім раёне вераць, што бачыць у сне жоўтую кветку – да разлукі [ПА; Шчэдрагор Валынскай вобл.]. Ва ўсходняй частцы Польшчы жоўты колер азначае рэўнасць, а пабачаныя ў сне кветкі прадказваюць хваробу [21, с. 30].Відаць, таму гэты колер (калі не асацыюецца з золатам) актыўна не прадстаўлены ў вясельнай абраднасці, выключаецца з касцюмаў жаніха і нявесты, яе вянка. Калі мяркуецца проціпастаўленне жоўтага колеру чырвонаму, першы з іх атрымлівае адмоўную ацэнку, што можа быць адлюстраваннем апазіцый "хвароба/здароўе" (як у рытуалах лекавання), "нецнатлівасць/цнатлівасць". Так, на другі дзень вяселля група гасцей ідзе да хросных маці маладой і маладога. Калі нявеста аказалася "чэснай", то ідуць з чырвоным сцягам, калі не – то без сцяга ці з жоўтым [ПА; Вышэвічы Радомышльскага р-на Жытомірскай вобл.].

Разам з тым, у вясельных песнях "жоўты" можа вызначацца пазітыўнымі канатацыямі, калі выступае складнікам "партрэтаў" персанажаў абраду. У рускай песні паэтызуюцца "желтые кудерки" жаніха [12, с. 234]. Ва ўкраінскай вясельнай песні жоўты корань явара – прыродная паралель да залатой касы нявесты [13, с. 42]. Спарадычна сустракаюцца элементы жоўтага колеру пры апісанні касцюма нявесты і жаніха ды іншых персанажаў абраду ("*Чы ўдома дзеванька Мырыся-душа, // Яна для мяне адна хараша... // З валошачкі вянок, // Жоўты паясок...*" [4, кн. 4, с. 63]), пры гэтым можа дэманстравацца сацыяльны прэстыж героя: "*...А што ў атласе, у жоўтым пасе – то дзевер мой*" [4, кн. 4, с. 94]. Паводле шэрагу беларускіх песень, дзяўчаты з жоўтых кветак робяць вянкі. Архаічныя тэксты дыялагічнай структуры акцэнтуюць увагу на тым, што "*рута цвіце жоўтым цветам*" [3, с. 301], а з гэтай расліны традыцыйна рабіўся шлюбны вянок. Дарэчы, жаўцізна руты можа не мець выразнай станоўчай ацэнкі нават у кантэкстах, дзе гэтая расліна выступае матэрыялам для шлюбнага вянка, – паводле вясельнай песні, якая выконвалася па дарозе ў царкву, "рута-мята" жаўцее "ад слёзачак" [4, кн. 3, с. 296]. У сірочых вясельных песнях з матывам "трох замочкаў" жоўты пясок мае адмоўную ацэнку: ён "засыпаў вочкі","залёг у насочак" памерлым бацькам нявесты і перашкаджае ім прыбыць на вяселле [4, кн. 3, с. 222]. У беларускіх каравайных песнях жаўцізна ўспрымаецца як пазітыўная якасць каравая, што, відаць, звязана з сімволікай плоднасці яйка: "*...А прывязлі сем коп яец да на каравай. // Хвала табе, божа! // Жовет бу-*

*дзець наш каравай"* [4, кн. 2, с. 48]. Жоўтымі звычайна малююцца вянчальныя свечы [4, кн. 2, с. 588]. У беларускіх вясельных песнях з матывам прарочага сну жоўты шоўк, развешаны галубамі на варотах, інтэрпрэтуецца як дарогі, якія чакаюць нявесту [4, кн. 1, с. 52].

Што да зялёнага колеру, то ён у вясельнай абраднасці мае пераважна станоўчую ацэнку. Хоць спарадычна сустракаюцца забароны на яго прысутнасць. Прыкладам, негатыўная ацэнка зялёнага (як пасіўнага, гнілога, хтанічнага, тагасветнага) адлюстравана ў вераванні, занатаваным намі ў в. Амельянец Камянецкага р-на, што каравайніца не павінна быць з зялёнымі вачыма, інакш шлюб будзе няўдалым [ФЭАБ]. Зялёны колер часта ўтварае блокі з іншымі колерамі, у прыватнасці з чырвоным і сінім. Паводле беларускіх вясельных песень, касцюм нявесты маркіруецца зялёным, сінім і чырвоным колерамі [4, кн. 3, с. 383]. Спалучэнне надзеленых пазітыўнай семантыкай зялёнага, чырвонага, белага колераў – фарбаў квітнеючай расліннасці, на ўлонні якой нявеста звівае шлюбныя вянкі сабе і жаніху [8, с. 235] ці каравайніцы збіраюць матэрыял для ўпрыгожання караваю [4, кн. 2, с. 144], – характэрнае для вясельнай (а таксама вясенне-летняй) песеннасці беларусаў, рускіх, сербаў і іншых славян. Сам вянок нявесты можа характарызавацца названымі колерамі: *"Я ж табе вяночак старгаваў... // І з беленькае паперы, // А з чырвонае каліны, // І з зялёнае барвіны"* [4, кн. 2, с. 286].

"Мужчынская " сімволіка зялёнага колеру і яго прадуцыравальнае значэнне выразна выяўлены ў балгарскім вясельным звычаі сцяліць пад ногі жаніху зялёны дыван, у той час калі для нявесты прызначаўся чырвоны [1, с. 648]. У вясельнай, як, дарэчы, і радзіннай, абраднасці зялёны колер можа карэляваць з сінім на аснове іх сімвалічнай асацыяцыі з катэгорыяй мужчынскага. Між тым зялёным ручніком маглі падпяразваць нявесту, у прыватнасці ў Варонежскай вобласці [12, с. 416].

У абрадах жыццёвага цыкла, як і ў паваротныя моманты года, шырока скарыстоўваецца зялёная расліннасць, пры дапамозе якой рэалізуецца прадуцыравальная і апатрапеічная семантыка абрадаў. Асабліва часта ў вясельнай абраднасці славян фігуруюць вечназялёныя расліны з іх прадуцыравальнай сімволікай (матэрыял для вянкоў, упрыгожання ўдзельнікаў абраду, а таксама каравая, вясельнага дрэўца, вупражы каня, варотаў, памяшкання). *"Кажут, на вэнок пошлі хлопцы, дэўчата. Сповают ўсю ноч. Квэточкі плетут тые, некі ленточкі тако банціком, туды зэлёнэнького вазоніка, шо ростэ, такі колюшчэвэнькі. Тако цэлэ сітэчко наробят. А вжэ як прыедэ жэніх, усім ужэ прычэпвают гэты квэточкі"* [ФЭАБ; Дзягелец Бярозаўскага р-на]. Сімвалам дзявочасці выступаюцьзялёныя ялінка і сасна ("куст","краса"), галінкі якіх, у прыватнасці ў Гарахавецкім краі, упрыгожваюцца зялёнымі і чырвонымі паперкамі [16, с. 142]. У рытуальных дыялогах, якія гучаць падчас выкупу "куста",падкрэсліваецца, што ён зялёны [16, с. 144].

Абрадавая практыка скарыстання зялёных раслін і станоўчая семантыка іх вобразаў прадстаўлены ва ўсходнеславянскай паэзіі вяселля. Прыкладам могуць быць вясельныя песні тыпу *"Ой, дайтэ мні голку і ныточку шоўку, // Прышыйтэ квіточкі з зэленого бэрвіночку..."* [ФЭАБ; Моталь Іванаўскага р-на]. У шматлікіх вусна-паэтычных творах зялёны колер асацыюецца з дзявоцкасцю, зялёны вянок – атрыбут нявесты: *"Ой, вэнку, мэй вэнку, // У зэлёным бэрвінку. // Купався на рынку, // Заховався в скрынку"* [ФЭАБ; Коланск Івацэвіцкага р-на]; *"...Повна хата дывочок // Зав'ють тобі выночок // Із руты зылёныі, // Із ружы чырвоныі "* [ФЭАБ; Дзягелец Бярозаўскага р-на]; *"Наша молода // Вэлікі розум мае. // Назбірала хату дэвочок // На зэлены вэночок, // А сама пошла до комороньκі // З батэньком говорыты..."* [ФЭАБ; Дзягелец Бярозаўскага р-на]; *"Колечка ялавец сячэ, // Нінаацы ён вянок нясе... // Не глядзі, што яловенькі, // Абы быў зялёненькі"* [4, кн. 2, с. 289].У галашэннях па дзяўчыне згадваюцца зялёная рута для шлюбнага вянка (*"Не гібаці табе ніколі караваю, // Не расціці табе зялёнае рутанькі..."* [11, с. 365]) і сам зялёны вянок, які памерлая не паспела

надзець пры жыцці: *"Куды ж гэта я цябе выпраўляю? // Ой, ня ў цэркаўку пад вянец зеляненькі, // Ай, на магілу ў пясок сыранькі…"* [11, с. 356]. У сувязі з важнай роляй зеляніны ў вясельным абрадзе цікавы замоўны матыў выправоджвання ў засветы хваробы, якой прапануецца нарваць"зеллечка сабе на вяселлечка".

Сімволіка зялёнага колеру (вянка) і белага колеру (чапца) акцэнтуецца ў кантэкстах перамены сацыяльнага статуса нявесты. На Куявах перад "oczepinami" маладую хавалі ў каморы са словамі *"Nasza, nasza, zielenisię"* (г. зн. нявеста носіць вянок з руты), пасля чаго "starościny " здымалі з петляў дзверы і прамаўлялі: *"Nasza, nasza, bielisię"* (г. зн. хутка нявесце апрануць жаночы чапец) [22, с. 148]. Такая ж проціпастаўленасць зялёнага і белага колераў касцюма лімінальнай істоты выразна выяўлена ў беларускіх песнях, што выконваліся падчас завівання маладой: *"– Упавілі-увіктавалі, // Каб людзі не пазналі. // – А каб мы схацелі, // То б яе развярцелі, // Скінулі б бялёнага, // Налажылі б зялёнага"* [4, кн. 6, с. 297].

Пазітыўна вылучаюць, стылістычна індывідуалізуюць персанажаў вясельных абрадаў зялёныя вопратка і абутак, пры гэтым "зялёны" звычайна асэнсоўваецца як 'прыгожы', 'святочны', 'дарагі', 'новы', 'лепшы', прыкладам: *"Зялёны кабат разлагаецца, // Маці дачкою набіваецца… "* [4, кн. 1, с. 128]; *"Да што ў зялёным, на кані вароным– // Дзевер мой, дзевер мой…"* [4, кн. 4: 95]. Ва ўсходнеславянскіх песнях зялёная вопратка можа пазітыўна маркіраваць жаніха (*"Алексей-господин… // Он зелен сафьян сапог // Надевает, надевает, // Он сам себя // Озирает, озирает: // "Ахти, молодец, // Хорошенек…"* [12, с. 331]) і нявесту (*"Па ком мая дзевачка, ўдалася, // Па пояс золатам лілася, // Ай, па плечанькі серабром. // Зялёны атлас па пояс…"* [4, кн. 4, с. 383]). Паводле вясельных песень, нявеста просіць: *"Прадай, прадай, татусечка, // Зяляненкі сад // Да й спраў жа ты, мой родненькі, // Увесь панарад: // Саяны зеляныя мушкаваны…"* [4, кн. 1, с. 134], *"Спраў мне, матулька, дарагі тавар: // Зялёну сукенку да долу…"* [4, кн. 1, с. 135], *"Спраў мне зялёную спаднічаньку, // Ой, сляды замятаць "* [4, кн. 1, с. 137], *"Звіце вяночак для мяне // На зялёненькай кітайцы"* [4, кн. 2, с. 202] (у варыянце кітайка пазначана чырвоным колерам). Зялёным маркіруюцца і іншыя вобразы, якія маюць больш ці менш выразныя міфа-рытуальныя канатацыі: віно, кубак, скрыня і пад. Зялёнае віно як рытуальны напой згадваецца ў шматлікіх вясельных (як і іншых) песнях (*"Сваночко, молодая, мы тэбэ даўно ждалі, // Даўно ждалі і мосты слалі. // Мосты слалі: одзін мост каліновы, // Другі маліновы, коб сваха нэ ўпала // І коровая нэ зломала, // І зэлёного віна нэ вылівала"* [ФЭАБ; Зубачы Бярозаўскага р-на]; *"Как и Нина Петровна душа… // На подносике носила // Две чары зеленого вина…"* [12, с. 292]. Паводле адной з песень, хлопец абяцае ўзяць за жонку дзяўчыну нават *"без пива, без мёду, // Без зелёного вина"* [12, с. 191]. Зялёным колерам маркіруецца кубак, з якога частуюцца ўдзельнікі вясельнайурачыстасці: *"…Яго цёшча выходзя, // Зялёны кубак вынося…"* [4, кн. 4, с. 78]. У вясельных песнях спяваецца пра зялёную скрыню, у якой знаходзіцца прыданае нявесты [4, кн. 1, с. 281], а таксама пра зялёныя масты, праз якія пралягае далёкішлях маладога па маладую [4, кн. 1, с. 265].У шэрагу фальклорных кантэкстаў эпітэт "зялёны" ў сэнсе "малады" сімвалічна суадносіцца з бадзёрасцю, сілай, весялосцю, рашучасцю.

Пакідаючы ў баку аналіз сімволікі сіняга і чорнага колераў у традыцыйнай культуры славян (падрабязны разгляд міфалогіі названых колераў у культуры беларусаў гл. [19, с. 203–226]), адзначым негатыўныя канатацыі гэтых цёмных колераў у забаронах на іх прысутнасць у вопратцы дзяцей, дзеля прадухілення змрочнасціх жыцця. Такія ж забароны могуць тычыцца вясельнайатрыбутыкі. На Палессі пры ўпрыгажэнні вясельнага стала не дапускаецца прысутнасць сіняга і чорнага колераў. Калі нявеста частавала сваіх родных хлябцамі, сцялілі сурвэткі – *"красны, билы можно, а сине, чорны не можно"* [ПА; Шчэдрагор Ратнаўскага р-на Валынскай вобл.]. Адмоўная ("смяротная") семантыка сіняга ўскосна ці непасрэдна прадстаўлена ў вясельнай абрадавай паэзіі, прыкладам у рускіх

іранічна-дразнільных (“корильных”) песнях тыпу: *“Шея-то синя, // Будто в петле была! // Нос-от синь – // Это свахин сын”* [12, с. 377]. Паводле сірочай вясельнай песні беларусаў, нявеста пускае “сіні папер” па вадзе – пісьмо памерлай маці з просьбай “прыбыць” на вяселле [4, кн. 3, с. 209].

Між тым, эпітэт “сіні ” ў фальклорных тэкстах мае адметныя значэнні і аксіялагізацыю адносна розных з’яў і персанажаў рытуалу. Шэраг рэалій сіняга колеру ў вясельных песнях усходніх славян адзначаны пазітыўнай ацэнкай. Паводле беларускіх вясельных песень, сінія кветкі з’яўляюцца самымі жаданымі ў вянку нявесты. Часам яна адмаўляецца ад вянка з руты і мяты (“Рута ды мята мне не прыятна”), ад вянка з ружы (“Ружова рожа мне не прыгожа”), а жадае вяночка з “сінь васілёчка” (“Сінь васілёчак мне на вяночак”) [4, кн. 2, с. 216]. У адной з песень актуалізуецца архаічны вобраз “сіняга саколіка ”, які размяшчаецца наверсе трох’яруснага Сусветнага дрэва і звязаны з ідэяй стварэння новай сям’і, з вянчаннем маладых [4, кн. 1, с. 221]. У сіняй карэце, паводле іншых беларускіх песень, жаніх едзе па нявесту [4, кн. 1, с. 429], маладыя вяртаюцца з вянчання [4, кн. 3, с. 332]. Сінія элементы касцюма становча вылучаюць каравайніцу (*“Да ў нашае каравайніцы // Сінія запаясачкі… // Чырвоныя закаўрашачкі”* [4, кн. 2, с. 648]), свата (*“… Ды што ў сінім, на каню сівым – то сват мой…”* [4, кн. 4, с. 94]), у варыянце песні – суседзяў. Ва ўкраінскіх прыпеўках сінія дэталі вопраткі таксама пазітыўна характарызуюць галоўных персанажаў вясельнага абраду, у прыватнасці нявесту (*“Приїхала пані // В синьому жупані, // Стала серед двору // Та й проситься в комору”), дружку (“Наш дружбонько, як пан, як пан. // А на ньому синій жупан…”* [13, с. 235, 203]). У рускіх вясельных песнях сіняя вопратка маркіруе нявесту і жаніха. Прыкладам, жаніх пераводзіць нявесту праз раку (што сімвалізуе шлюб) і супакойвае яе: *“Ты за синь кафтан подержися, // Ты за пуговки золотые, // За петельки шелковые…”* [12, с. 343]. У рускіх вясельных прыгаворах, як указвае Ю. Крашанніннікава, у апісаннях непажаданых для нявесты і жаніха прысутных (старых людзей, дзяцей) семантыка храматычнай характарыстыкі “сіні” найбольш блізкая да семантыкі гэтага колераабазначэння ў народнай культуры, дзе сіні дэманструе ўстойлівую сувязь з паняццямі дэманічнага, нячыстага, сапсаванага, а таксама беднасці, паўсядзённасці. Адносна жаніха і яго акружэння эпітэт “сіні” набывае значэнні ‘святочны’, ‘дарагі’, ‘новы’, ‘лепшы’, звязаныя з эстэтычнай ацэнкай, а таксама скарыстоўваецца ў якасці маркёра асобай падзеі, бо сінія дэталі вопраткі вылучаюць жаніха, паязджанаў, гасцей, запрошаных у хату жаніха з боку нявесты, сярод іншых прысутных на вяселлі. Датычна нявесты і жаніха “сіні” сустракаецца спарадычна пры згадванні паўсядзённай працоўнай вопраткі, неабходнай для далейшага сумеснага жыцця маладой пары. У гэтым кантэксце “сіні” ўяўляе сабой адзін з паэтычных сродкаў, пры дапамозе якога “прагаворваецца” ідэя далучэння маладых да іншай узроставай групы [10, с. 76].

Сімволіка шэрага колеру пераважна актуалізуецца ў вербальнай кампаненце вясельнай чыннасці. Касцюм шэрага (“сівага”) колеру не мае адназначнай ацэнкі ў абрадавым фальклоры. Убранне нявесты ў вясельных песнях можа мець як пазітыўныя, так і негатыўныя канатацыі. Так, у сірочых вясельных песнях шэрая (‘бедная’, ‘саматканая’) вопратка – “сярмяжкі сівенькі” – належыць нявесце-сіраце і проціпастаўляецца шыкоўным сукенкам [4, кн. 3, с. 47]. Дарэчы, у вясельных галашэннях рускіх нявеста можа адмаўляцца ад рознаколеравай вясельнай сукенкі, выказваючы жаданне застацца ў шэрым – сіроцкім адзенні. З іншага боку, асобныя кантэксты паказваюць на пазітыўную ацэнку “сівай світы”, якая пазначае высокі сацыяльны статус нявесты: *“– Чы то мяшчанка, чы то баярка? // На ёй сіва світа з адкладам шыта…”* [4, кн. 3, с. 378]. У шэрай вопратцы могуць малявацца іншыя асэнсаваныя ў пазітыўным ключы персанажы вясельнага абраду: *“Ды што ў дзязе, у шэрай сярмязе – дзевер мой”* [4, кн. 4, с. 95].

У вясельных (як і радзінных) песнях беларусаў і іншых славян шэрыя, "сівыя" жывёлы надзяляюцца медыятыўнай семантыкай. У сірочых вясельных песнях "шэрую пташачку-салавеечку" ці шэрую зязюлю пасылаюць на той свет па памерлага бацьку [4, кн. 3, с. 178, 195], сівага каня – па "радзіну на Украіначку " [4, кн. 3, с. 193]. "Сірі гуси", паводле ўкраінскіх вясельных песень, "навіки" адносяць нявестава "дівування" ў "чужы" свет: чыстае поле, сіняе мора, раку [13, с. 220] (як і шэрая мыш выдаляе першы выпаўшы зуб дзіцяці з чалавечага свету). Пазітыўнае значэнне прыпісваецца вобразам "сівых коней" і "сівых валоў", якія служаць знакам багацця, высокага статуса гаспадара, галоўнага персанажа абраду. Удзельнікаў вясельнага абраду, як спяваецца ў песнях, возяць на сівых ці сівагрывых конях, сівых валах. Сівы сокал, паводле ўкраінскіх песень, з'яўляецца сімвалам жаніха (ён хапае чорную галку – нявесту), сівыя селезні – прыроднай паралеллю да дружак, якія апранаюць нявесту і садзяць яе на пасад. Сама маладая ва ўсходнеславянскіх, у прыватнасці ўкраінскіх [13, с. 138] песнях можа асацыявацца з сівой лябёдачкай, шэрай качкай [12, с. 212], шэрай паванькай [4, кн. 1, с. 54], сівой кунай [4, кн. 1, с. 174]. У рускіх песнях "козушка-белонозушка" (нявеста) утварае пару шэраму ваўку (жаніху) [12, с. 313], белая лебедзь (нявеста) проціпастаўляецца "серым гусям, серым утицам","черным гусям-серым утицам" – "чужим людям", прадстаўнікам роду жаніха, якія да яе дрэнна ставяцца [12, с. 247, 268]. Паводле галашэння нявесты, яе "зычен голос" павінен бегчы "серым заюшком" [12, с. 388]. Сівы салавей у садзе – паэтычнае ўвасабленне старога бацькі нявесты ў беларускіх вясельных песнях. Міжжанравы вобраз-сімвал сівой кабылы нярэдка актуалізуецца ў парадыйна-насмешлівых вясельных песнях, прыкладам: "*За гарой сваты гаманілі, гаманілі, // Сівую кабылу павалілі, павалілі, // Кабыла зарзала, зарзала, // Сватам вочы заплявала*" [4, кн. 4, с. 149].

У заключэнне адзначым, што сімвалічная метамова славянскага вяселля скарыстоўвае асноўныя колеры: чырвоны, белы(вызначаюцца асаблівай частотнасцю і прадуктыўнасцю), чорны, сіні, зялёны, шэры, жоўты. Названыя колеры перадаюць сэнсы, істотныя для руху рытуалу і яго выніку і вызначаюцца полівалентнай і амбівалентнай сімволікай, выяўляюць двaістасць адносна фундаментальных апазіцый тыпу жыццё/смерць, чалавечае/не-чалавечае, шчасце/няшчасце, выступаюць маркёрам этапаў жыццёвага шляху чалавека, пераадолення ім рытуальных меж. На колеравай прыкмеце засноўваюцца ідэнтыфікацыя і звязаныя з ёю семантызацыя і функцыянальнасць прадмета ў пэўным вясельным рытуале ў адпаведнасці з тэлеалогіяй апошняга, колер выступае знакавай дэталлю ўдзельнікаў абраду і падарункаў, якімі яны абменьваюцца. Гэта знаходзіць адпаведнае праламленне ў вуснай паэзіі, колеравы код якой з'яўляецца адным з найпрадуктыўнейшых мастацкіх рэсурсаў. Праз яго перадаецца цэлы комплекс этнафізіялагічных, этнамедыцынскіх, этнаэстэтычных і іншых уяўленняў. За пэўнымі тэкстамі вясельных абрадаў з іх семантыкай пераходу, пераадолення рытуальных меж, проціпастаўлення жыцця і смерці і проціставяння апошняй, забеспячэння плоднасці і будучага дабрабыту нявесты ды жаніха, а таксама здароўя і прыгажосці іх дзяцей, замацаваныя вызначаныя чыннікі колеравага кода. Разгледжаныя колеры актывізуюцца ў перакадаванні між рознымі чыннікамі мікра- і макракосмаў і не толькі кадзіруюць вясельны абрадавы тэкст, але і ўзмацняюць яго агульную скіраванасць, праз аб'яднанне ў пэўныя семіятычная блокі робяць тэкст выразным і шматгранным. У пэўных рытуальных кантэкстах рэалізуюцца сувязі семіятычных колеравых апазіцый і больш складаных міфапаэтычных карэляцый – трыяд, тэтрад: белы/чорны, чырвоны/чорны, сіні/зялёны, чырвоны/зялёны, жоўты/чырвоны і інш., элементы якіх могуць не толькі проціпастаўляцца, але і дапаўняць ці нейтралізаваць адзін аднаго.

## ЛІТЕРАТУРА

1. *Белова О. В.* Красный цвет / О. В. Белова // Славянские древности: Этнолингвистический словарь в 5 т. / Под общ. ред. Н. И. Толстого. – Москва : Международные отношения, 1999. – Т. 2 : Д–К (Крошки). – С. 647–651.

2. *Березович Е. Л.* Язык и традиционная культура / Е. Л. Березович. – Москва : Индрик, 2007. – 600 с.

3. Валачобныя песні / Склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей, В. І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.

4. Вяселле. Песні ў 6 кн. / Склад. Л. А. Малаш, З. Я. Мажэйка. –Мінск : Навука і тэхніка, 1980–1988. – 6 кн.

5. *Ђорђевић Т. Р.* Животни круг: рођење. свадба и смрт у веровањима и обичајима нашег народа/ Т. Р. Ђорђевић. – Ниш : Просвета, 2002. – 452 с.

6. *Зеленин Д. К.* Восточнославянская этнография / Д. К. Зеленин. – Москва : Наука, 1991. – 512 с.

7. Зямная дарога ў вырай : Беларускія народныя прыкметы і павер'і ў 3 кн. / Уклад. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1996–1999. – Кн. 3. – 1999. – 654 с.

8. *Караџић В.* Сабрана дела. Кн. 17: Етнографски списи/ В. Караџић. – Београд : Просвета, 1972. – 682 с.

9. *Климчук Ф. Д.* Духовная культура полесского села Симоновичи / Ф. Д. Климчук // Славянский и балканский фольклор. Этнолингвистическое изучение Полесья / редкол.: Н. И. Толстой (отв. ред.). – Москва : Индрик, 1995. – С. 335–382.

10. *Крашенинникова Ю.* Из наблюдений над символикой цвета в русских свадебных приговорах / Ю. Крашенинникова // Славяноведение. – 2011. – № 2. – С. 71–77.

11. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / Уклад. У. А. Васілевіча, Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.

12. Русская народная поэзия. Обрядовая поэзия / Сост. К. Чистова, Б. Чистовой. – Ленинград : Художественная литература, 1984. – 527 с.

13. *Танцюра Г.* Весілля в селі Зятківцях / Г. Танцюра / Упоряд., ред. М. К. Дмитренко, Л. О. Єфремова. – К. : Ред. часопису "Народознавство ", 1998. – 404 с.

14. *Толстая С. М.* Одежда / С. Толстая // Славянские древности : Этнолингвистический словарь в 5 т. / Под общей ред. Н. И. Толстого. – Москва : Международные отншения, 2004. – Т. 3: К–П. – С. 523–533.

15. *Толстой Н. И.* Белый цвет / Н. И. Толстой // Славянские древности : Этнолингвистический словарь в 5 т. / Под общ. ред. Н. И. Толстого. – Москва: Международные отншения, 1995. – Т. 1: А–Г. – С. 151–154.

16. Традиционная культура Гороховецкого края в 2 т./ Сост. В. Е. Добровольская, А. С. Каргин. – Москва : ГРЦРФ, 2004. – Т. 1 – 368 с.

17. Традыцыйная мастацкая культура беларусаўу 6 т. / А.М. Боганева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2008. – Т. 4: Брэсцкае Палессе ў 2 кн. Кн. 1. – 559 с.

18. Украинцы / Отв. секретарь серии Л. И. Миссонова. – Москва : Наука, 2000. – 535 с.

19. *Швед І. А.* Міфалогія колеру ў беларускай традыцыйнай духоўнай культуры / І. А. Швед. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2011. – 291 с.

20. *Melicherčík A.* Slovensky folklór: chrestomatia/ A. Melicherčík. – Bratislava : V-vo Slovenskej akadémievied, 1959. – 796 s.

21. *Niebrzegowska S.* Przestrach od przestrachu. Rośliny w ludowych przekazach ustnych/ S. Niebrzegowska. – Lublin : W-wo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2000. – 265 s.

22. *Ogrodowska B.* Zwyczaje, obrzędy i tradycje w Polsce/ B. Ogrodowska. – Warszawa : Verbinum, 2001. – 310 s.

## СКАРАЧЭННІ

ПА – Палескі архіў Інстытута славяназнаўства РАН

ФЭАБ – фальклорна-этнаграфічны архіў вучэбнай фальклорна-краязнаўчай лабараторыі БрДУ (кіраўнік – І. А. Швед).

## Slavonic Wedding Ceremonies through the Prism of Colour Code of Mythopoetic Consciousness

Ina SHVED

*The author analyses the colour code in Slavonic ceremonial texts of wedding, revealing the syntagmatic and paradigmatic connections of colour symbols (white, black, red, yellow, green, blue, grey). As a result of historical-genetic and functional-semantic studies of colour code in wedding ceremonies and Slavonic folk overview, motivated by the changes in the social and familial status of newly-weds,  the conclusion is drawn that the elements of colour models help to model the phases of the bride and bridegroom's transition into a new condition, to symbolically and magically generate a happy life for the newly-weds and their next generation as well as to express the ideas of defence, compensation while transmitting information about the psycho-physical, social, material status of participants of wedding ceremony, revealing aesthetic and other values.*

*Key words: ceremony, wedding, colour code, semantics, symbolism.*

## Славянские свадебные обряды сквозь призму цветового кода мифопоэтического сознания

Инна ШВЕД

*В статье анализируется «язык» цвета в славянских обрядовых свадебных текстах, выявляются синтагматические и парадигматические связи цветовых символов (белого, черного, красного, желтого, зеленого, синего, серого).В результате историко-генетического и функционально-семантического исследования цветового кода свадебного обряда и славянских народных представлений, связанных с изменением социального и семейного статуса молодых, делается вывод, что при помощи элементов цветового кода моделируются фазы перехода невесты и жениха в новое состояние, символически и магически продуцируется благополучная жизнь молодоженов и их будущих детей, выражаются идеи защиты, компенсации, ликвидации определенного дефицита, транслируется информация о психофизическом, социальном, материальном состоянии участников свадебного обряда, выявляются эстетические и иные оценки.*

*Ключевые слова: обряд, свадьба, цветовой код, семантика, символика.*

Стаття надійшла до редколегії 20.11.2012.
Прийнята до друку 25.12.2012.

## Нові книги


МІНІСТЕРСТВО ОХОРОНИ ЗДОРОВ'Я УКРАЇНИ
ЗАПОРІЗЬКИЙ ДЕРЖАВНИЙ МЕДИЧНИЙ УНІВЕРСИТЕТ

САЗАНОВИЧ ЛАРИСА ВІКТОРІВНА

АМЕРИКАНСЬКА ФОЛЬКЛОРНА БАЛАДА:
ІСТОРІЯ, КЛАСИФІКАЦІЯ, МОДЕЛЬ ТЕКСТУ

Монографія

Запоріжжя - 2012

**Сазанович Л. В. Американська фольклорна балада: історія, класифікація, модель тексту. – Запоріжжя: ЗДМУ, 2012. – 164 с.**

Уперше розглянуто проблему стереотипізації на маловідомому матеріалі американської англомовної фольклорної балади. Висвітлено теоретико-методологічну специфіку підходів до аналізу стереотипізації як міждисциплінарного явища. Узагальнено особливості ставлення представників різних національних шкіл до окреслення проблеми типового у фольклорі. У базовому третьому розділі книги досліджено ідейно-тематичну палітру і композиційні моделі стереотипності американської англомовної фольклорної балади; увагу приділено, зокрема, тематичному й ідейному аспектам стереотипізації, визначенню усталених елементів сюжету та їх функцій у цілісній структурі баладного тексту.